ISSN 2708-1095

# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ



ВЫПУСК 4

«ДОЛГИЙ XIX ВЕК»

4

ISSN 2708-1095

Государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы»

# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ

Сборник научных трудов

Основан в 2017 году

Выпуск 4

Минск
РИВШ
2020

pawet.net

УДК 94(47/49)«18»(082)

Рекомендовано
редакционно-издательской комиссией
ГУО «Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 6 от 19 декабря 2019 г.)

Редакционная коллегия:
чл.-кор. НАН Беларуси, д-р ист. наук, проф. *И. А. Марзалюк* (пред.);
канд. ист. наук, доц. *С. Ф. Шимукович* (отв. за выпуск);
д-р ист. наук, проф. *В. А. Космач*;
д-р ист. наук, проф. *В. С. Кошелев*;
д-р ист. наук, проф. *Г. Г. Лазько*;
д-р ист. наук, проф. *А. М. Лютый*;
д-р истории *О. Мастяница-Станкевич* (Литва, Вильнюс);
д-р ист. наук, проф. *С. И. Никонова* (Россия, Казань);
д-р ист. наук, проф. *И. Р. Чикалова*;
д-р ист. наук, проф. *В. И. Яковчук*;
канд. ист. наук, доц. *В. А. Сосно*;
канд. ист. наук, доц. *В. А Теплова*

Д64 «**Долгий** XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: исследования по Новой и Новейшей истории: сб. науч. тр. Вып. 4 / редкол.: И. А. Марзалюк (пред.) [и др.]. – Минск : РИВШ, 2020. – 242 с.

Сборник научных трудов, включенный ВАК Республики Беларусь в перечень научных изданий для опубликования результатов диссертационных исследований, содержит научные статьи, в которых ученые-историки рассматривают разные аспекты развития Восточной Европы и территории современной Беларуси в интересный, насыщенный событиями исторический период, обозначенный Э. Хобсбаумом как «долгий XIX век». Издается в рамках Государственной программы научных исследований «Экономика и гуманитарное развитие белорусского общества» на 2016–2020 гг. (задание 1.1.03 «История и культура», подзадание 1.1.03.3 «Формирование элит на территории Беларуси в XIX – начале XX века», № госрегистрации 20160828).

Адресован профессиональным и начинающим исследователям, преподавателям, студентам и всем, кто интересуется историей Нового времени Беларуси.

© Оформление. ГУО «Республиканский институт высшей школы», 2020

# РАЗДЕЛ 2. ИДЕНТИЧНОСТИ И КУЛЬТУРА ЭЛИТ И НАСЕЛЕНИЯ В ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЕ

*Дзярновіч А. І.*
ДНУ «Інстытут гісторыі Нацыяльнай акадэміі навук Беларусі»,
Мінск, Беларусь

*Dziarnovich A.*
Institute of History, NAS of Belarus, Minsk, Belarus

**УДК 930.2(474)**

## «МАГІЛА ВОЛАТАЎ»: РЭАКТУАЛІЗАЦЫЯ НАРАЦЫІ ПРА ШТУРМ ЗАМКА ПІЛЕНЫ Ў 1336 ГОДЗЕ І ФАРМІРАВАННЕ ГІСТАРЫЧНАГА МІФА ЛІТОЎСКАЙ НАЦЫІ Ў XIX СТАГОДДЗІ

## «TOMB OF THE GIANTS»: REACTUALIZATION OF THE NARRATIVE ABOUT THE STORMING OF THE PILĖNAI CASTLE IN 1336 AND THE FORMATION OF THE HISTORICAL MYTH OF THE LITHUANIAN NATION IN THE 19TH CENTURY

*Звесткі пра штурм замка Пілены на жамойцка-прускай мяжы ў 1336 г. упершыню былі зафіксаваныя ў «Новай прускай хроніцы» Віганда Марбургскага, дзе галоўным быў сюжэт супрацьстаяння хрысціян і паганцаў. Гэты ж сюжэт атрымаў распаўсюджанне ў рэнесанснай гістарыяграфіі ВКЛ, у якой узмацніліся этнічныя маркеры. Але сапраўдны інфармацыйны выбух вакол Піленаў і яе абаронцаў адбыўся ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. Пасля засваення гэтага сюжэту гістарыяграфіяй Асветніцтва ў гістарыяграфіі Рамантызму на першы план выйшла маральна-этычная інтэрпрэтацыя гераічнага ўчынку. Найважнейшая роля тут належала Аўгусту фон Кацэбу, які і стварыў канон нарацыі пра Пілены XIX ст. Гэтая рамантычная плынь і сімпатыя да «варвараў» была падхоплена не толькі гісторыкамі, але таксама мастакамі, літаратарамі і кампазітарамі з зямель былога Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку на прыкладзе Піленаў і яго героя князя Маргера (Маргіціса) фарміраваўся літвінскі шляхецкі патрыятызм.*

*У канцы XIX – пачатку XX ст. сюжэт гераічнага калектыўнага суіцыду становіцца культавым сярод удзельнікаў літоўскага нацыянальнага руху.*

*Рэактуалізацыя памяці пра трагедыю Піленаў і гераічная інтэрпрэтацыя звестак гістарычных крыніц сталі адными з тых ідэалагічных падстаў, на якіх у XIX ст. фарміраваўся праект сучаснай літоўскай нацыі. Поруч з гераізмам адной з найважнейшых характарыстык у ацэнцы падзей 1336 г. становіцца ахвярнасць.*

*Ключавыя словы: сярэднявечныя хронікі; Рэнесанснае гісторыяпісанне; гістарыяграфія Асветніцтва і Рамантызму; праект літоўскай мадэрнай нацыі; гістарычны міф.*

*Information about the storming of the Pilėnai Castle on the Samogitian-Prussian border in 1336 was first recorded in the «New Prussian Chronicle» by Wigand of Marburg, where the main plot was the confrontation between Christians and Pagans. The same plot became widespread in the Renaissance historiography of the Grand Duchy of Lithuania, in which ethnic markers were strengthened. But the real information explosion about Pilėnai and its defenders took place in the late 18th – mid 19th centuries. After mastering this plot by the historiography of the Enlightenment, the moral and ethical interpretation of the heroic deed came to the fore in the historiography of Romanticism. The most important role here belonged to August von Kotzebue, who created the canon of the narrative about Pilėnai in the 19th c. This romantic current and sympathy for the «barbarians» was picked up not only by historians but also by artists, writers and composers from the lands of the former Grand Duchy of Lithuania, including the example of Pilenov and his hero Prince Marger (Margiris), formed Litvinian aristocratic patriotism.*

*In the late 19th and early 20th centuries, the plot of the heroic collective suicide became cult among the participants of the Lithuanian national movement. The reactualization of the memory of the Pilėnai tragedy and the heroic interpretation of data from historical sources became one of the ideological foundations on which the project of the modern Lithuanian nation was formed in the 19th c. Along with heroism, one of the most important characteristics in the assessment of the events of 1336 is sacrifice.*

*Keywords: medieval chronicles; Renaissance historiography; historiography of the Enlightenment and Romanticism; the project of the Lithuanian modern nation; historical myth.*

## Сюжэт для антычнай трагедыі

Адзін з самых красамоўных эпізодаў экспансіі Нямецкага ордэна ў Балтыйскім рэгіёне і яго супрацьстаяння з Вялікім Княствам Літоўскім і землямі, якія ў будучым увойдуць у яго склад, звязаны з легендарным штурмам замка Пілены ў 1336 г. Гэтая падзея адбылася падчас выправы (рэйду) ордэнскага аддзела на чале з вялікім магістрам Дытрыхам фон Альтэнбургам (з роду бурґграфаў Альтэнбурга; вялікі магістр 3.V.1335–6.X.1341).

Кіраванне вялікага магістра Дытрыха было адметным тым, што ён прыцягнуў у дапамогу Ордэну новыя сілы рыцараў-візіцёраў з Цэн-

тральнай і Заходняй Еўропы: аддзелы герцага Брандэнбургскага, графаў з Фландрыі (comes de Namen), Францыі, германскіх (Hennenberg) і аўстрыйскіх земляў. Узімку 1335–1336 гг. агульная колькасць гэтых добра ўзброеных «гасцей» дасягала звыш за 200 'galea' (шаломаў) [48, s. 196].

Паводле паведамленняў нямецкіх ордэнскіх хронік, аб'яднаныя ордэнскія аддзелы 25 лютага 1336 г. выправіліся на Літву і ўзялі ў аблогу «castrum Pillenen in terra Troppen». Як можна зразумець, гэты «замак Пілены» ў «зямлі Тропен» быў важным апорным пунктам у Жамойці на мяжы з ужо заваяванай Ордэнам Прусіі. Зямля Тропен, як і замак Пілены, не маюць дакладнай лакалізацыі. Мяркуецца, што яны знаходзіліся на паўночным (правым) беразе ніжняга Нёмана.

Апісанні падзей у замку Пілены, пакінутыя ордэнскай хронікай, нагадваюць па сваёй стылістыцы і маштабу антычную трагедыю. Гэтыя апісанні пакінуў ордэнскі храніст Віганд Марбургскі, паводле слоў якога да Піленаў прыйшло больш за 4000 чалавек з чатырох земляў. Пабачыўшы ордэнскае войска, язычнікі «згубілі надзею на ўтрыманне замка» і пакідалі сваю маёмасць у полымя. Затым адбыўся акт калектыўнага суіцыду. Драматызм нарацыі надае аповед пра «vetula pagana» («старую паганку»), як можна меркаваць – жрыцу, якая сякерай забіла 100 сваіх супляменнікаў, а потым і сябе.

Граф Гененберг узяў пад кантроль замак, але некаторыя яе абаронцы, параненыя, здолелі сысці на конях. Правадыр паганцаў, якога хроніка называе «Rex Lithwanorum», быў абаронены тарчамі сваіх слугаў. «Ахоплены страхам», ён уцёк да нейкай хованкі, дзе закалоў сваю жонку і кінуў яе цела ў агонь. Паганцы, уражаныя такой паразай, нахілілі свае галовы, і правадыр іх усіх пазабіваў. «Castrum Polenen» быў разбураны, і з яго былі выведзены палонныя і вынесена багатая здабыча [48, s. 198].

Базавыя звесткі пра падзеі пад Піленамі першым зафіксаваў, з таго што на сёння вядома, храніст Віганд Марбургскі (фон Магбургскі) (каля 1365–1394/1409). Сам Віганд не з'яўляўся рыцарам Ордэна, але быў герольдам вялікага магістра Конрада Валенрода (1391–1393). Хроніка Віганда ахоплівае перыяд 1293–1394 гг. і з'яўляецца адной з найважнейшых крыніц па гісторыі Нямецкага ордэна ў Прусіі. Першапачатковы тэкст хронікі быў напісаны рыфмаванай прозай на сярэдневерхне-нямецкай мове (vulgari teutonico).

У сярэдзіне XV ст. па ініцыятыве польскага гістарыёграфа і каралеўскага прыдворнага Яна Длугаша (1415–1580) быў зроблены

лацінскі пераклад хронікі. На працягу XV–XVI стст. у Польшчы і Вялікім Княстве Літоўскім да лацінскага тэксту неаднаразова звярталіся храністы і гістарыёграфы (Ян Длугаш, Мацей Мяхоўскі, Марцін Кромер, Мацей Стрыйкоўскі, Альберт Віюк-Каяловіч). Апроч таго, на базе захаваных частак нямецкага арыгінала ў Прусіі ў XVI ст. узнікла новая традыцыя нарацыі пра Пілены (Сімон Грунаў, Лукас Давід, Каспар Шуц) [17, S. 359–364; 18, p. 49–60].

**Гістарыяграфія Асветніцтва і Рамантызму**

Праз дзвесце гадоў пасля ўзнікнення новай прускай традыцыі гісторыяпісання XVI ст., якая надала ўвагу Піленам, і праз сто гадоў пасля штудый Альберта Віюка-Каяловіча ў ВКЛ тэма аблогі замка Маргірыса зноў вярнулася на старонкі гістарыяграфічных прац. Ажывіў гэты сюжэт нямецкі і расійскі гісторык, вядомы нарманіст і выдаўца рускіх летапісаў [38] Аўгуст Людвіг Шлёцэр/August Ludwig Schlözer (1735–1809) у сваёй агляднай працы «Geschichte von Littauen, als einem eigenen Großfürstenthume, bis zum Jh. 1569» («Гісторыя Літвы, як уласна Вялікага Княства, да 1569 г.») [39]. Сам жа А. Шлёцэр, як ужо адзначалася [25, p. 57], падчас напісання сваёй працы шмат у чым абапіраўся на «Гісторыю Літвы» Альберта Віюка-Каяловіча [49; 50].

І сапраўды, нарацыя А. Шлёцэра пра Пілены шмат у чым падобная да апісання гэтай аблогі ў А. Віюка-Каяловіча. З самага пачатку гістарычны адрэзак, у які адбываліся гэтыя падзеі, А. Шлёцэрам, услед за гістарыёграфам ВКЛ, пазначаецца як перыяд уладарання Альгерда, які напярэдадні вёў стрыманую палітыку: «Einige Jahre ruhte Olgerd aus» [39, S. 69]. Нямецкі гісторык паўтарыў базавыя звесткі пра колькасць літоўцаў у 4000 і пра калектыўны суіцыд абаронцаў замка Пілены. Але гэты аповед вёўся без прыўнясенні такіх каларытных дэталяў, як сакральная сякера прарочыцы. Апошні сюжэт быў прапісаны ў першакрыніцы – у «Хроніцы» Віганда Марбургскага, але адсутнічаў у «Аналах» Яна Длугаша, якія атрымалі пашырэнне ў Польшчы і ВКЛ. Для гістарычнай тапанімікі важна таксама тое, то А. Шлёцэр запазычыў у А. Віюка-Каяловіча адну з формаў напісання назвы замка – Пуня: «das schloß Pullen oder besser Punie». Гэтая своеасаблівая вольнасць у перадачы тапонімаў ужо ў XIX ст. спрычынілася да ўзаемнага накладання двух гістарычных міфаў.

Увогуле ж А. Шлёцэр, які лічыцца найбольш выбітным прадстаўніком Гётынгенскай гістарычнай школы і заснавальнікам сла-

вістыкі ў Гётынгене [8, с. 211–212], зыходзіў з таго, што ўсе народы і гістарычныя эпохі, пра якія захаваліся верагодныя звесткі, заслугоўваюць стараннага навуковага вывучэння [7, с. 87]. Гётынгенскі ўніверсітэт, дзе навучаўся А. Шлёцэр і куды ў 1769 г. ён вярнуўся прафесарам пасля акадэмічнай працы ў Швецыі і Расіі, быў цэнтрам руху па пераўтварэнні гісторыі ў самастойную навуковую дысцыпліну, што стала адметнай рысай гістарыясофскай традыцыі Асветніцтва. Гэта была спроба стварэння канцэпцыі Сусветнай гісторыі.

Іншую базу крыніц па штурму Піленаў мела праца прускага літаратара і гістарыёграфа Людвіга фон Бачка/Ludwig von Baczko (1756–1823) «Гісторыя Прусіі», выдадзеная ў Кёнігсбергу праз восем год пасля выхаду з друку кнігі А. Шлёцэра. Л. фон Бачка выкарыстоўваў звыклую для прускага гісторыяпісання XVI ст. форму тапоніма: «Pullen oder Pulleyen». Форму «Pullen» выкарыстоўваў і Лукас Давід у «Прускай хроніцы» [23, S. 130], а таксама Каспар Шуц у «Прускай гісторыі» [40, Bl. 77r]. Гэтыя адсылкі важныя, таму што дазваляюць зразумець, адкуль Л. фон Бачка ўзяў падрабязныя звесткі пра фартыфікацыю Піленаў. Гэты сюжэт Л. фон Бачка суправадзіў заўвагай, што «варта прыкласці намаганні, каб пазнаёміцца з гэтай надзвычай моцнай крэпасцю літоўцаў, бо яна дае нам уяўленне пра іх веды і іх ваеннае мастацтва» («Es ist der Mühe werth, diese vorzüglich starke Veste der Litthauer etwas näher kennen zu lernen, weil sie uns einen Begriff von ihren Kenntnissen und ihrer Kriegskunst beybringt») [14, S. 112]. Далей гістарыёграф прывёў колькасныя даныя па памерах сцен драўлянага замка: сцены мелі вышыню ў 83 пядзі (х 20 см = 16,6 м) і таўшчыню ў 52 пядзі/Spannen (х 20 см = 10,4 м), роў меў глыбіню 26 футаў/Schuh (х 30 см = 7,8 м) і шырыню 50 футаў (х ≈ 30 см = 15 м) («Sie war aus dicken Rahnen erbaut, die 83 Spannen hoch und 52 Spannen dick übereinander lagen, und von einem 26 Schuh tiefen und 50 Schuh breiten Graben umgeben wurden») [14, S. 112]. Ніжэй Л. фон Бачка спасылаўся на працы Лукаса Давіда і Каспара Шуца. У Лукаса Давіда якраз гэтыя звесткі і прысутнічаюць, але першапачаткова яны былі названыя ў «Пруская хроніцы» Сімона Грунаў [24, S. 582]. Трэба адзначыць, што гістарыяграфічны наратыў Л. фон Бачкі меў апавядальнасць, літаратурны стыль. Як бачым, Л. фон Бачка ў сваіх штудыях абапіраўся на прускія хронікі XVI ст. і працягнуў гэтую традыцыю гісторыяпісання ўжо ва ўмовах Асветніцтва.

Яшчэ больш белетрызавана выглядае апісанне падзей у Піленах у Аўгуста фон Кацэбу/August Friedrich Ferdinand von Kotzebue (1761–

1819). Гэты нямецкі аўтар вядомы ў большай ступені як драматург і раманіст і меў нестандартную біяграфію – з'яўляўся газетным агентам на расійскай службе ў Остзейскім краі, быў вядомы сваімі нападкамі на нямецкія лібералізм і нацыяналізм, а загінуў ад кінжала студэнта-радыкала Карла Людзвіга Зандта [6, с. 177–191; 51, p. 890–943; 53]. А. фон Кацэбу меў сур'ёзныя зацікаўленні ў гісторыі рэгіёна – ад Прусіі да ВКЛ. У прыватнасці, яго пяру належыць праца па палітычнай біяграфіі князя Свідрыгайлы [9].

Сапраўды маштабным праектам нямецкага літаратара і гістарыёграфа стала «Гісторыя старажытнай Прусіі», выдадзеная ў 4 тамах у 1808 г. [26]. Менавіта на старонкай гэтай сінтэзы А. фон Кацэбу звярнуўся да трагічных падзей 1336 г. і надаў сваёй нарацыі выразныя літаратурныя рысы. «Самай дзіўнай падзеяў гэтага [1336 г.] рэйду» аўтар называў разбурэнне замка Пілены, якое застанецца «толькі помнікам адвагі тых паганцаў, вартым пяра Тацыта, як і ліры Гамера»: «Doch die merkwürdigste Begebenheit jenes Streifzuges, die Zerstörung der Burg Pulleyen, ist und bleibt nur ein Denkmal der Tapferkeit jener Heiden, würdig der Feder eines Tacitus wie der Leyer eines Homer» [26, Bd. 2, S. 171]. У адпаведнасці з традыцыямі рамантызму нямецкі аўтар выказвае свае сімпатыі «высакародным варварам», распавядаючы пра іх барацьбу ў гераічным ключы: «Sie fochten nicht blos für ihre Götter, ihren Ruhm, ihr Eigenthum; auch was dem Menschen am liebsten ist, ihre Weiber und Kinder umschlossen die hölzernen Mauern» («Яны змагаліся не толькі за сваіх багоў, славу, маёмасць; таксама за тое, што найбольш дарагое чалавеку, іх жонкі і дзеці»). Галасы крэўных абуджалі мужнасць абаронцаў: «So oft sie rückwärts blickten, hoben sich unbewehrte Hände um Schutz flehend auf, und wohlbekannte, an das Herz dringende Klagestimmen befeuerten thätigen, erweckten gesunkenen Muth».

У А. фон Кацэбу з'явіліся новыя дэталі аблогі Піленаў. Паводле аўтара, адну з найважнейшых роляў падчас штурму выканалі трыццаць лучнікаў рыцара Вернера фон Рандорфа, якія выпусцілі 600 стрэлаў, абматаных каноплямі і змочаных у смале: «Fast verzweifelnd starrten die Fliehenden das trozzige Holzschloß an, als Ritter Werner von Randorf, listiger als tapfer, unter seine dreyßig Bogenschützen sechshundert Pfeile vertheilte, deren Widerhaken, mit Hanf in Pech getränkt umwunden, brenend hinüber flogen, brenend in die Balken drangen, und an hundert stellen die Feste in Brand steckten» [26, Bd. 2, S. 172]. Агонь зрабіў немагчымым абарону драўлянага замка, і далей наступіла трагічная развязка, вядомая ўжо

з ранейшых крыніц. Фактычна А. фон Кацэбу літаратурнымі сродкамі ўзмацніў драматызм гучання гісторыі пра абарону Піленаў.

У далейшым сюжэт пра Пілены атрымаў развіццё ў маштабнай працы па гісторыі Прусіі, аўтарства якой належала нямецкаму гісторыку і прафесару Кёнігсбергскага ўніверсітэта Ёганесу Фойгту/Johannes Voigt (1786–1863). Дзевяцітомная «Гісторыя Прусіі ад найстаражытнейшых часоў да падзення ўладарання Нямецкага ордэна» выходзіла з друку на працягу 1827–1839 гг. Апісанне падзей пад Піленамі было змешчана ў чацвёртым томе маштабнай працы Ё. Фойгта «Гісторыя Прусіі». У тэме, прысвечанай Піленам, Ё. Фойгта звярнуў увагу на некалькі асаблівасцяў. Ці не першым з гісторыкаў гэты гістарыёграф, звярнуўшы ўвагу на розныя формы напісання тапоніма, прааналізаваў формы назвы Піленаў у нямецкай традыцыі гісторыяпісання –сярэднявечных хроніках і творах аўтараў ранняга Новага часу. Ён, апроч іншага, прапанаваў сваю лакалізацыю замка Пілены – на паўночны захад ад Расейнаў у цэнтральнай Жамойці: «…die altheidnische Burg Pillenen im Lande Troppen, warscheinlich in Samaiten nordostwärts von Rossiena hinauf» [47, S. 535]. Правадыр піленцаў фігуруе ў Ё. Фойгта ўжо не пад тытулам «кароль», а «князь» (Fürst Marger). Таксама нямецкі гісторык працягнуў прускую традыцыю аповеду пра старую паганскую жрыцу з ахвярнай сякерай: «dem Opferbeile einer alten Priesterin». Ё. Фойгт таксама даў сваю інтэрпрэтацыю рэакцыі ордэнскай выправы. Паводле гісторыка, нямецкія ваяры ўздрыгнуліся ад жудаснага крывапраліцця, і іх кроў ледзь не застыла, калі яны ўвайшлі ў замак: «Mit schauder nahmen die Deutschen Krieger das entsetzliche Blutbad wahr und fast erstarrte ihr Blut, als sie den Boden der gräßlichen That betraten» [47, S. 537]. Але гэты супраціў піленцаў меў тактычныя наступствы – уражаныя духам народа, нямецкія аддзелы не адважыліся рушыць далей у гэты край: «Bei solchem Geiste des Volkes aber wagte das Deutsche Kriegsheer nicht weiter in das Land einzudringen» [47, S. 537].

Маштабныя працы А. фон Кацэбу і Ё. Фойгта, створаныя пад уплывам гістарыяграфіі Рамантызму, заклалі канон нарацыі пра Пілены ў XIX ст. Таксама трэба адзначыць, што іх працы базаваліся на прускай гістарыяграфічнай традыцыі, але аўтары прыўнеслі ў інтэрпрэтацыю далёкіх па часе падзей свае маральна-псіхалагічныя інтэрпрэтацыі, што ўвогуле было адной з рысаў рамантычнай гістарыяграфіі.

## Рост цікавасці ў былым ВКЛ

Распрацоўкі нямецкай гістарыяграфіі знайшлі водгук на землях былога Вялікага Княства Літоўскага. Але першай мастацкай рэфлексіяй на гістарычныя падзеі стала палатно польскага мастака Уладзіслава Канстанціна Маераноўскага/Władysław Konstanty Majeranowski (1817–1874), які паходзіў з падаўстрыйскага Кракава. Яго эпічнае палатно «Апошняя сцэна Маргера» («Ostatnia scena Margiera») было выканана ва ўласцівай для Рамантызму стылістыцы з апеляцыяй да легендарных сюжэтаў і характарызавалася моцнай экспрэсіяй. Створаны ім вобраз апошніх хвілін жыцця правадыра паганцаў Маргера стаў адным з самых моцных у мастацкім увасабленні падзей пад Піленамі. Сімвалізм карціны У. К. Маераноўскага прачытваўся як антынямецкі, скіраваны супраць Прусіі, адной з дзяржаў – удзельніц падзелаў Рэчы Паспалітай.

У 1837 г. з’явілася палатно прадстаўніка Віленскай мастацкай школы Вінцэнта Дмахоўскага (1805/07–1862) «Крыжакі перад атакай замка Пуня» [30, Nr. T-13]. Гэты твор, апроч іншага, ілюструе тэндэнцыю фактычнага накладання двух сюжэтаў – падзеі, апісаныя Вігандам Марбургскім пад Піленамі ў 1337 г., сталі пераносіцца на выправу 1382 г. на зямлю Пуня, апісаную таксама Вігандам Марбургскім («in terra Punnow») [48, s. 472]. Свой жа твор В. Дмахоўскі стварыў у 1837 г. пасля вяртання на Радзіму па амністыі для ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. [5, с. 100]. Вяртанне мастака супала з 500-гадовым юбілеем бітвы пад Піленамі.

Тэкстуальная легітымацыя сюжэта Піленаў у другой чвэрці XIX ст. адбылася на старонках працы Тэадора Нарбута (1784–1864) «Гісторыя літоўскага народу». Паўтарыўшы ў асноўным канву падзей, як яна выкладаецца ў папярэдніх аўтараў, у яго наратыве заўважны ўплыў А. фон Кацэбу, напрыклад, эпізод са стрэламі: «W tem krzyżak Wernerrandorf rozdał między trzydziestu wybrańszych sześćset strzał palnych, które za jednym razem gradem ognistym okryły grod cały» [37, s. 601–602]. Т. Нарбут узбагаціў свой тэкст дэталямі пра словы жрыцы і алтар Зніча. Але найбольшая адметнасць метаду нарацыі Т. Нарбута – гэта гіпербалізацыя падзей, у тым ліку калі ён мультыплікуе колькасць ахвяраў да 12 тысяч: «ludu zdatnego do obrony było w Pullen cztery tysiące; zapewne dwa razy tyle kobiet, dzieci i starców liczyć można; sławny przeto ten stos pogrzebny zarazem pochłonąć musiał najmniej dwanaście tysięcy ludzi» [37, s. 604]. У любым выпадку, Т. Нарбутам была не столькі створана,

колькі ўзмоцнена гераічная і адначасова трагічная карціна літоўскага мінулага.

Праз восем год пасля выдання працы Т. Нарбута з'явіўся том па ВКЛ маштабнага праекта «Старажытная Польшча», які падрыхтавалі Міхал Балінскі (1794–1864) і Цімафей Ліпінскі (1797–1856). М. Балінскі замацаваў у свядомасці чытацкай публікі атаясамленне Піленаў і Пуні ў раёне Аліты: «Punie od krzyżaków *Pullen* zwane, albo *Pillenen*, miasteczko nad brzegiem niemna niżej olity o mil 7½ od trok, o milę od Stokliszek» [15, s. 427] (вылучэнні ў тэксце М. Балінскага). Пры гэтым М. Балінскі спасылаўся на польскага і літвінскіх аўтараў: «…wielki drewniany zamek, mocno obwarowany, pamiętny bohaterską obroną za olgerda litwinów przeciw krzyżakom, której Długosz, Stryjkowski i Kojałowicz pamięć nam zachowali» [15, s. 427]. Хоць у звестках пра Маргера гісторык адсылаў да прускіх хронік праз пасярэдніцтва Ё. Фойгта («*Marger* niejaki dowódca załogi, królikiem litewskim od dziejopisów pruskich zwany»), важна таксама тое, што М. Балінскі падаў дату падзей як 1336 г., што таксама замацавалася ў наступнай традыцыі.

Лічбу ахвяраў у 12 тысяч, выведзеную Т. Нарбутам, выкарыстаў літаратар і гісторык Юзаф Ігнацы Крашэўскі (1812–1887) [28, s. 222]. Да сюжэту Піленаў ён звярнуўся ў сваёй гістарычнай сінтэзе «Літва». Пры тым, што аўтар імкнуўся да белетрызацыі ўласнай нарацыі, ён паставіў некалькі новых пытанняў у тэме Піленаў. Так, напрыклад, Ю. Крашэўскі вывеў назву замка Пілены ад літоўскага *pilis* – замак: «…stary gród Pilleny (Pillen od Pillis grobla, szaniec, twierdza – tak u Wiganda; inni kroniści dziwnie nazwanie przekręcają)» [28, s. 228]. Увогуле Ю. Крашэўскі ўвёў у апісанне гістарычных падзей шмат вядомых яму балта-літоўскіх рэалій: пазначэнне Маргера як кунігаса; характарыстыка яго як чалавека «непераможнай яцвяжскай адвагі», а таксама адсылкі да міфалагічных уяўленняў, да Неба (Dangus), на якім знаходзіўся Вырай і куды адпраўяцца душы памерлых абаронцаў Піленаў: «Wszyscy idą chętnie, idą na tę śmierć, która ich w niebie ojców, w kraju wschodnim, w Dungusie, prze obrażonych, odmłodzonych, szęśliwych, z duchami bohaterów połączy» [28, s. 220]. Галоўная ж місія Ю. Крашэўскага – паказаць сапраўдны гераізм, «прыкладу якога няма ў нашай гісторыі»: «Z prawdziwym heroizmem, którego nie znamy w naszych dziejach przykładu, wszyscy ofiarowali się na śmierć dobrowolną, byleby ani łupu, ani siebie nie dać w ręce nieprzyjaciela» [28, s. 220].

Сапраўднае мастацкае ўвасабленне Ю. Крашэўскім гісторыя замка Пілены і князя Маргіціса атрымала ў гістарычным рамане «Кунігас» [27].



*Мал. 1.* **Міхал Эльвіра Андрыёлі (1836–1893) «Смерць Маргера і Банюты». Ілюстрацыя да рамана Юзафа Ігнацы Крашэўскага «Кунігас» (1882)**

Твор упершыню быў апублікаваны ў 1882 г., а ілюстрацыі для выдання падрыхтаваў слынны ўжо Міхал Эльвіра Андрыёлі (1836–1893). Серыя яго ілюстрацый, выкананых паводле рамантычнай мастацкай традыцыі, стала класічнай і ў далейшым неаднаразова ўзнаўлялася [11] (мал. 1). У другой палове XIX ст. Ю. Крашэўскі стаў адным з самых папулярных аўтараў у Расіі, а пераклад «Кунігаса» з'явіўся ў Санкт-Пецярбургу ў 1899 г. і перавыдаваўся падчас Першай сусветнай вайны [10, с. 1–216].

Ю. Крашэўскі сканструяваў нязвыклы лёс літоўскага героя Маргера. Паводле раманіста, у дзіцячым узросце Маргер быў захоплены крыжакамі падчас аднаго з рэйдаў у глыб літоўскай тэрыторыі, атрымаў хрысціянскае імя Юрый і выхоўваўся ў Мальбарку ў належным атачэнні. Аднак «голас крыві» прывёў юнака да сваіх суродзічаў, і Маргер-Юрый узначаліў абарону Піленаў ад крыжакоў.

Але для чытача XIX ст. фабула рамана Ю. Крашэўскага ўтрымлівала ўнутраную палеміку: Маргер быў Анты-Валенродам. Сюжэт рамана «Кунігас» моцна залежаў ад паэтычнага рамана Адама Міцкевіча «Конрад Валенрод» [4, с. 146], які меў падназву «Раман гістарычны з гісторыі літоўскай і прускай». Сваю паэму-раман А. Міцкевіч напісаў паміж 1825 і 1828 гг. падчас высылкі на тэрыторыі Расіі, а менавіта ў Санкт-Пецярбургу. Пасля выдання ў лютым 1828 г. «Конрад Валенрод» [36] стаў лічыцца адным з найбольш знаных літаратурных твораў польскага рамантызму. Паводле сюжэту, галоўны герой паэмы літоўскі хлопчык Альф, як і Маргер, трапляе ў крыжацкі палон. Хлопца выхоўвае як роднага сына вялікі магістр Вінрых. Нягледзячы на добрае абыходжанне з боку немцаў, Альф, вонкава скарыўшыся, употай трымае нянавісць да Ордэна. Палонны літоўскі пясняр Гальбан намаўляе Альфа, каб той даведаўся ад немцаў пра ўсё, а затым выкарыстаў гэтыя веды супраць

іх, бо «адзінай зброяй нявольнікаў ёсць здрада»: «Tyś niewolnik, jedyna broń niewolników jest zdrada» (у першым выданні гэты радок быў адцэнзураваны). У першай сутычцы з літоўцамі, у якой Альф бярэ ўдзел, ён пераходзіць на бок літоўцаў і дапамагае ім перамагчы. У будучым, пасля наведвання Ерусаліма, Альф выдае сябе за графа Конрада Валенрода, які загінуў у Святой Зямлі пры невядомых абставінах, і нават абіраецца вялікім магістрам Ордэна.

Адкуль узнікла гэта дзіўная аналогія, што галоўны герой паэмы А. Міцкевіча мае тое ж імя, што і вялікі магістр Ордэна, які быў непасрэдным кіраўніком Віганда Марбургскага, стваральніка легенды пра Пілены? Конрад фон Валенрод (1330/1340–1393) паходзіў з рыцарскага франконскага роду і на працягу 1391–1393 гг. быў 24-м вялікім магістрам Нямецкага ордэна. У сваёй палітыцы гэты магістр сапраўды быў моцна арыентаваны на Вялікае Княства Літоўскае, у прыватнасці, першапачаткова падтрымліваў Вітаўта ў яго канфлікце з Ягайлам, а ў студзені 1393 г. арганізаваў па выніках няўдалы паход на Гародню. Сярод ордэнскіх храністаў склаўся негатыўны вобраз гэтага вялікага магістра, які быў недастаткова шчодры да царквы, а паданні зрабілі з Конрада нават літвіна. Сам А. Міцкевіч ведаў пра існаванне гістарычнага Конрада Валенрода і пісаў у каментарыях да паэмы, што рэальны Валенрод сапраўды паставіў Ордэн на грань пагібелі, а сам памёр пры цьмяных абставінах. Можна сцвярджаць, што выбар імя і эпохі быў у паэта невыпадковым і дыктаваўся той мастацкай задачай, якую ён сабе сфармуляваў.

А. Міцкевіч выкарыстоўваў у паэме «гістарычныя маскі», адсылаючы да падзей сярэднявечнай гісторыі. У рэчаіснасці паэт закрануў праблемы краёвага патрыятызму XIX ст. Яшчэ пры жыцці А. Міцкевіча паэма дала назву такой этычна-маральнай плыні нацыянальна-вызваленчых рухаў, як «валенрадызм», што мела ў сваёй аснове дактрыну Макіявелі. Валенрадызм стаў пазначаць пазіцыю чалавека, які выкарыстоўвае падман і здраду для дасягнення высакароднай мэты.

Паняцце «валенрадызм» стала досыць папулярным яшчэ пры жыцці А. Міцкевіча [29, s. 995–996]. Але ў грамадстве стаўленне да валенрадызму было супярэчлівым. З аднаго боку, паэма «Конрад Валенрод» дакладна зафіксавала этычную дылему, у якой знаходзіліся змоўцы, якія рыхтаваліся да паўстання, што ўспыхне ў 1830 г. Сродкамі літаратуры праз метафару маральнага канфлікту фактычна быў кадыфікаваны новы ўзор патрыятызму, які мог быць рэалізаваны

ў канспіралагічнай і рэвалюцыйнай дзейнасці. Але некаторыя прадстаўнікі грамадскіх рухаў у XIX ст. прачыталі пасланне А. Міцкевіча вельмі даслоўна, таму ў аўтара выказваліся прэтэнзіі, што валенрадызм у аснове сваёй з'яўляецца маральнай пахвалой здрады і што ідэя помсты ў паэме важнейшая за ідэю любові да Айчыны. Аднак ідэя трагізму перакрывала гэтую палеміку пра валенрадызм.

Янка Купала абраў для перакладу ўступ да паэмы А. Міцкевіча, у якім наймацней гучыць тэма гістарызму падзей:

*З «Конрада Валенрода»*
*Сто лет мінала крыжацкай навале,*
*Як кроў з паўночных смактала паганаў.*
*Прусы ўжо шыі ў аковы згіналі*
*Або ўцякалі з радзімых палянаў;*
*Немец за ўцёкшым пускаўся ўдагонкі,*
*Нішчыў да самай літоўскай старонкі.*

*Літвінаў дзеліць ад ворагаў Нёман:*
*З аднаго боку льсняць стрэхі святыняў,*
*І лесу – схову багоў – чуваць гоман;*
*З другога – ўбіты на ўзгорку пустыні*
*Крыж, знак нямецкі, рад к небу сягнуці,*
*Грозна пільнуе літоўскіх загонаў,*
*Як бы ўсю чыста зямлю Палямона*
*Хацеў бы зверху здушыць, загарнуці.*

У сярэдзіне XIX ст. паўстаў яшчэ адзін паэтычны твор, які апеляваў да падзей пад Піленамі. Гэта была паэма Уладзіслава Сыракомлі (1823–1862) «Маргер». У «Слове ад аўтара» У. Сыракомля спасылаўся на ордэнскую хранікарную традыцыю: «Litewscy i pruscy kronikarze zapisali pod r. 1336 napad krzyżacki na zamek Pullen, bohaterską jego obronę przez wodza Margiera i zgon Litwinów, którzy nie chcąc się żywo oddać w ręce nieprzyjaciół, sami się na stosie na ofiarę swym bogom pozabijali» [42, s. V]. Галоўная ідэя паэмы была ўкладзена аўтарам у вусны галоўнага героя падчас адважнага самагубства [42, s. 134]:

*Margier kołpak soboli zdjął z rycerskiej głowy:*
*«Witam cię, chrobra Litwo, w otchłani grobowej!*
*Daj świadectwo niebiosom w uroczystej dobie,*
*Żem cześć twoją ocalił i zginął przy tobie!*
*Nie umarłaś spodlona – tylko nieszczęśliwa!»*

Аўтар апавядае пра адну лакальную падзею, імкнецца стварыць агульную карціну гісторыі Літвы, скласці пэўны заканамерны абрыс эпохі ордэнскай экспансіі [2, с. 221]. Спалучэнне «харобрай Літвы» і адчайнага ўчынку фарміруе маральна-этычны комплекс прачытання гісторыі і яе інтэрпрэтацыі ў актуальным для аўтара XIX ст.

У. Сыракомля планаваў сцэнічна ўвасабіць сваю паэму і падрыхтаваў для кампазітара Станіслава Манюшкі ўласнае лібрэта [52, s. 11]. Але рэалізаваў гэтыя тэатральныя задумы іншы выбітны кампазітар, ураджэнец Ліды Канстанцін Горскі (1859–1924), які стварыў оперу «Маргер» у трох актах (шасці дзеях). Пры гэтым кампазітар не скарыстаў лібрэта У. Сыракомлі, а паклаў у аснову сваёй оперы лібрэта аўтара, пазначанага крыптонімам W.W.G. Транскрыпцыя для фартэпіяна была апублікавана ў Санкт-Пецярбургу ў 1905 г., але саму оперу паставілі толькі 13 студзеня 1927 г. на сцэне Вялікага тэатра ў Познані. Фінальная сцэна оперы стварала атмасферу гераізму, у аснове якой ляжала ахвярнасць: «Lud zaklina bogi, by wyzwolili ich z pęt ciała. Na oczach oszołomionych Krzyżaków wszyscy wskakują na stos. Wszystko niknie w kłębach dymu».

Можна сцвярджаць, што опера К. Горскага падсумоўвала «літвінскі этап» развіцця легенды пра Пілены, пік якога прыйшоўся на сярэдзіну XIX ст. Спецыфіка літвінскага прачытання легенды палягала ў тым, што ў межах гэтай канцэпцыі меліся адсылкі да старажытнай літоўскай гісторыі, але новы наратыў мусіў быў абуджаць патрыятызм славянамоўнай, пераважна польскамоўнай, шляхецкай супольнасці на землях былога ВКЛ.

**Нацыянальны інструменталізм**

Паралельна з пашырэннем сюжэта ў польскамоўнай літвінскай літаратуры краю нарацыя пра Пілены пачала трапляць і ў літоўскамоўную гістарыяграфію, якая толькі нараджалася. Першым аўтарам з гэтай плыні стаў асветнік і адзін з ідэолагаў літоўскага нацыянальнага руху Сімонас Даўкантас/Szymon Dowkont (1793–1864). С. Даўкантас скончыў Віленскі ўніверсітэт у 1822 г., але з-за працэсу філаматаў-філарэтаў дыплом магістра права атрымаў толькі ў 1825 г. У далейшым ён працаваў у канцылярыі Рыжскага генерал-губернатара (1825–1834) і, што стала вельмі важным для яго прафесійнага росту як гісторыка, памочнікам метрыканта пры канцылярыі Сената ў Санкт-Пецярбургу (1835–1851). Гэта значыць, што ў сталіцы імперыі С. Даўкантас непасрэдна працаваў з Метрыкай ВКЛ.

Яшчэ ў студэнцкія гады С. Даўкантас падрыхтаваў першую сваю працу па гісторыі Літвы «Darbai senųjų lietuvių ir žemaičių» («Дзеянні старажытных літоўцаў і жамойтаў», 1822). У сваёй нарацыі пры перадачы тапоніма ён спыніўся на версіі Punie, якую ў свой час прыняў А. Шлёцэр. Сучасны літоўскі даследчык Вітаўтас Мяркіс падлічыў, што ў гэтым творы С. Даўкантаса з 245 спасылак 89 адсылаюць да прац А. фон Кацэбу, 62 – да А. Віюка-Каяловіча, 29 – да М. Карамзіна, 15 – да А. Глябовіча, 10 – да Т. Нарбута [35, p. 106–107]. Таксама ў сюжэце пра Пілены С. Даўкантас абапіраўся на працы А. фон Кацэбу і А. Віюка-Каяловіча. У нарацыі С. Даўкантаса была ўзмоцнена маральна-псіхалагічная складовая частка, падкрэслівалася жаданне літоўцаў памерці, але не стаць рабамі крыжакоў. Ён дазволіў Маргірысу сказаць: «Няхай нявінная кроў цячэ па галовах гэтых крывасмокаў, якія адбіраюць у нас свабоду, якую далі самі багі». І дадаў: «Мы дзякуем нябесным, што сёння мы можам памерці на свабодзе, нягледзячы на тое, што нас прыгнятаюць». Праблема ж у тым, што «Darbai senųjų lietuvių ir žemaičių» пры жыцці С. Даўканаса так і засталася ў рукапісу [32, p. 488–490; 46, l. 684–691] і была апублікавана толькі ў XX ст. [22, T. 1, p. 289–292].

Такі ж лёс напаткаў яшчэ адну гістарыяграфічную працу С. Даўкантаса, дзе ён апісваў падзеі пад Піленамі. Гэта «Istorija žemaitiška» («Жамойцкая гісторыя») [21, p. 573–576; 31, l. 252–253v.; 32, p. 488–490], створаная на працягу 1831–1834 гг. У гэтай працы аўтар выкарыстоўваў ужо тапонім «Pylene». Адметнасць нарацыі С. Даўкантаса заключалася ў тым, што, прызнаючы размяшчэнне замка Пілены ў Жамойці, аўтар імкнуўся паказаць інтэгральную гісторыю Жамойці як часткі Літвы, як братоў Літвы і Жамойці: «broliu Letuiu ir Zemaitiu». «Istorija žemaitiška» сведчыць пра эвалюцыю гістарыяграфічнага метаду С. Даўкантаса і змены ў цытаванні. Так, у працы ўтрымліваецца 320 спасылак, згадваецца прыблізна 70 аўтараў, гэта былі пераважна нямецкія гісторыкі. У той жа час адбыўся істотны зрух у частотнасці спасылання на працы: А. фон Кацэбу (18 спасылак) выпаў з фаварытаў і прыярытэты былі зменены на Ё. Фойгта (75 спасылак) [35, p. 107–108]. З пункту гледжання рэпрэзентатыўнасці базы крыніц «Istorija žemaitiška» сведчыла ўжо пра большую сталасць С. Даўкантаса як гісторыка. Апроч запазычанняў з іншых прац гісторыяпісання, гісторык працаваў і непасрэдна спасылаўся на сярэднявечныя тэксты – Лівонскую рыфмаваную хроніку, хронікі Віганда Марбургскага, Пятра Дузбургскага, Лукаса Давіда.

Таксама ў рукапісе застаўся яшчэ адзін твор С. Даўкантаса «Pasakojimas apej wejkałus letuwiû tautos senowie, kuri trumpaj apraszia Jonas Ejnoras metuse 1859» («Гісторыя пра старажытны літоўскі народ, каротка апісаная Ёнасам Эйнарасам у 1859 г.») [22, Т. 2, p. 449–451], у якім эпізод пра Пілены грунтаваўся на публікацыях Ё. Фойгта. З чатырох гістарыяграфічных прац С. Даўкантаса пры яго жыцці была апублікавана толькі адна, падрыхтаваная ім у Санкт-Пецярбургу: «Budą Senowęs Lietuwiû kalneniu ir Żemaitiû» («Звычаі старажытных літоўцаў, горцаў і жамойтаў»; «горцы» – тут маюцца на ўвазе аўкштайты). Гэты твор выйшаў пад псеўданімам «Якуб Лаўкіс». Сюжэт Піленаў тут быў пададзены найкарацейшым у параўнанні з іншымі працамі С. Даўкантаса і ўтрымліваў толькі кароткую анатацыю падзей [20, p. 196–197].

С. Даўкантас заклаў асновы літоўскай (у этнічным сэнсе) рамантызаванай нацыянальнай гістарыяграфіі. Пілены былі прапісаныя ў гэтай версіі вельмі выразна найперш праз ахвярнасць учынку. Але застаецца пытанне, якім чынам у першай палове – сярэдзіне XIX ст. адбывалася трансляцыя нарацыі С. Даўкантаса сярод грамадскасці. Пакуль легітымнай застаецца версія пра абмежаванае ўздзеянне прац С. Даўкантаса пры яго жыцці. Але распрацоўкі гісторыка стануць вельмі запатрабаванымі ўжо ў канцы XIX – пачатку XX ст.

Яшчэ адзін прыклад рукапіснай цыркуляцыі нарацыі пра Пілены – тэкст Антанаса Валанчуса/Maciej Wołonczewski (1801–1875) «Pasakojimas antano Tretininko» («Аповеды Антанаса Трэцінінкаса») [45, Т. 1, p. 626–628], дзе эпізод пра Пілены таксама базаваўся на працы Ё. Фойгта «Гісторыя Прусіі». А. Валанчус важны для літоўскай культуры як літаратар-асветнік і рэлігійны дзеяч. У 1850 г. ён стаў Жамойцкім (Цяльшайскім) біскупам, а ў 1858 г. ініцыяваў рух цвярозасці. І А. Валанчуса, і С. Даўкантаса аб'ядноўвала тое, што абодва яны паходзілі з Жамойці, да таго ж з паўночна-заходняй яе часткі, бліжэйшай да Прусіі і латвійскай Курляндыі. У пэўным сэнсе іх дзейнасць была інспіраваная інтарэсамі і этнакультурным ландшафтам Жамойці. Але ў сваіх праграмах гэтыя асветнікі выходзілі на ўзровень кансалідаванай літоўскай нацыі. Эпізод Піленаў займаў важнае месца ў гістарычных праграмах заснавальнікаў літоўскага нацыянальнага руху.

На мяжы XIX–XX стст. адбылося замацаванне гістарычнага міфа ў літоўскай культурнай традыцыі. Яркай ілюстрацыяй таго, што Пілены сапраўды сталі месцам памяці, з'явіліся пастаноўкі народных тэатраў. У 1905 г. літоўскі пісьменнік і педагог Марцэлінас Шыкшніс/Marcelinas

Šikšnys (1874–1970) пад псеўданімам «M. Šiaulėniškis» апублікаваў п’есу «Піленскі князь», створаную паводле рамана Ю. Крашэўскага «Кунігас», што і было пазначана на вокладцы выдання [43, p. 1]. 6 мая 1906 г. п’еса была пастаўлена ў Віленскай ратушы. Лічыцца, што гэта была першая літоўскамоўная сцэнічная пастаноўка. У 1910 г. п’еса ставілася ў Рызе [33, Vieta byloje 161], што вельмі добра паклалася на антынямецкія настроі мясцовай латышскай грамады. Таксама ў 1910 г. таварыства «Varpas» здзейсніла гэтую пастаноўку ў Шаўлях [44, p. 99] (суч. Шаўляй) (мал. 2), горадзе, дзе М. Шыкшніс у 1893 г. скончыў гімназію. Шаўляйскі спектакль удалося паставіць у абыход цэнзуры [13, p. 57].



*Мал. 2.* **Фотаздымак з акцёрамі спектакля «Піленскі князь», пастаўленага ў 1910 г. таварыствам «Varpas» ў Шаўлях. П’еса Марцэлінаса Шыкшніса (пад псеўданімам «M. Šiaulėniškis»)**

Заканамерным этапам развіцця нацыянальнага гістарычнага міфа стала яго ўвасабленне ў гераічнай паэзіі. Такімі патрыятычнымі радкамі стаў верш класіка літоўскай літаратуры, каталіцкага святара Майроніса (Ёнаса Мачуліса) (1862–1932) «Ant Punės kalno ties Nemunu» («На пагорку Пуня ў Нёмана»), упершыню апублікаваны ў 1925 г. у каўнаскім літаратурна-мастацкім часопісе «Baras» [34, p. 5–8]. Гэты верш меў моцную рамантычную вобразнасць:

*Tai kapas Margio milžinų!*
*Nors amžių šešetą sukako,*
*Kaip jie – tik sauja pelenų!..*
*Tačiau daugiau už gyvus sako.*

*Гэта магіла волатаў Маргіса!*
*Хоць прайшло шэсць вякоў,*
*Што яны – проста жменька попелу!..*
*Але скажуць больш, чым жывыя.*

Майроніс прытрымліваўся традыцыйнай на той час лакалізацыі замка Пілены на гарадзішчы Пуня ў Троцкім павеце [41, T. 9, s. 300–301] (сёння Алітускі раён). Гарадзішча Пуня таксама размешчана на беразе Нёмна, але не ў Жамойці, а ў Дзукіі. Ля падножжа гарадзішча быў усталяваны мемарыяльны камень з працытаванымі вышэй радкамі Майроніса.

Вельмі паказальным сцэнічным увасабленнем літоўскага гістарычнага міфа пра Пілены стала гераічна-эпічная опера кампазітара Вітаўтаса Кловы/Vytautas Klova (1926–2009) «Піленай» у чатырох дзеях. Аўтарам лібрэта быў мастацтвазнавец і літаратар Ёнас Мацконіс/Jonas Mackonis-Mackevičius (1922–2002). Прэм'ера оперы адбылася 1 ліпеня 1956 г. на сцэне Літоўскага тэатра оперы і балета. У 1957 г. падчас гастроляў тэатра опера была паказана ў Маскве, у 1958 г. – у Ленінградзе. Увогуле опера заваявала ўвагу публікі і адзнак з боку літоўскага савецкага кіраўніцтва: у 1957 г. стваральнікі оперы атрымалі Дзяржаўную прэмію Літоўскай ССР, а В. Клова ў 1959 г. стаў заслужаным дзеячам мастацтва ЛітССР. Варта адзначыць, што для гастроляў у РСФСР быў выдадзены падрадковы пераклад лібрэта оперы [12]. У саму ж оперу, зважаючы на афіцыйную ідэалагічную дактрыну СССР, былі ўведзены новыя персанажы – рускі князь Даніла і спадарожнік князя пясняр Потык. Даніла застаецца змагацца разам з Маргірысам. Літоўскі ж князь перад самым драматычным момантам абароны агучвае сваю праграмную прамову [12, с. 32]:

*Пришёл и вам черёд, последние защитники Пиленай,*
*Смыть кровью крестоносцев ржавчину с мечей.*
*Обороняем мы Литву от хищных вражьих орд*
*И долю светлую грядущих поколений.*
*На жертвенник Отчизны жизнь свою приносим,*
*Но наша смерть и гибель – не бесплодны, –*
*Благословит Предвечного рука ту жертву*
*И память светлую о витязях отважных.*

У заключнай сцэне піленцы хорам спяваюць:

*Проклятье вам, неистовые упыри!*
*Всем вам проклятье!*
*Непобеждёнными мы умираем!*
*Занавес*

Настолькі моцныя словы можна лічыць квінтэсенцыяй эвалюцыі гістарычнага міфа Піленаў у літоўскай нацыянальнай свядомасці ад пачатку XIX ст. да часоў Савецкай Літвы [19, p. 389–463].

**Заключэнне**

Звесткі пра штурм замка Пілены на жамойцка-прускай мяжы ў 1336 г. упершыню былі зафіксаваныя ў «Новай прускай хроніцы» Віганда Марбургскага, дзе галоўным быў сюжэт супрацьстаяння хрысціян і паганцаў. Гэты ж сюжэт атрымаў распаўсюджанне ў рэнесанснай гістарыяграфіі ВКЛ, у якой узмацніліся этнічныя маркеры. Але сапраўдны інфармацыйны выбух вакол Піленаў і яе абаронцаў адбыўся ў канцы XVIII – сярэдзіне XIX ст. Пасля засваення гэтага сюжэта гістарыяграфіяй Асветніцтва ў гістарыяграфіі Рамантызму на першы план выйшла маральна-этычная інтэрпрэтацыя гераічнага ўчынку. Найважнейшая роля тут належала Аўгусту фон Кацэбу, які і стварыў канон нарацыі пра Пілены XIX ст. Гэтая рамантычная плынь і сімпатыя да «варвараў» была падхоплена не толькі гісторыкамі, але і мастакамі, літаратарамі, кампазітарамі з зямель былога Вялікага Княства Літоўскага, у тым ліку на прыкладзе Піленаў і яго героя князя Маргера (Маргірыса) фарміраваўся літвінскі шляхецкі патрыятызм.

З 1820-х гг. тэма Піленаў зацікавіла літоўскую інтэлігенцыю, якая стала пісаць па-літоўску. Але гэта былі рукапісныя тэксты, і абсяг іх цыркуляцыі не да канца зразумелы. У канцы XIX – пачатку XX ст. сюжэт гераічнага калектыўнага суіцыду становіцца культавым сярод удзельнікаў літоўскага нацыянальнага руху. Рэактуалізацыя памяці пра трагедыю Піленаў і гераічная інтэрпрэтацыя звестак гістарычных крыніц сталі аднымі з тых ідэалагічных падстаў, на якіх у XIX ст. фарміраваўся праект сучаснай літоўскай нацыі. Поруч з гераізмам аднойз найважнейшых характарыстык у ацэнцы падзей 1336 г. становіцца ахвярнасць.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Аладава, Р. Н.* Константин Горский и его опера «Маргер» в контексте белорусской культуры. / Р. Н. Аладава – Минск: Белорус. гос. акад. музыки, 2005. – 216 с.

2. *Варабей, М.* Хрысціянізацыя ВКЛ вачыма Уладзіслава Сыракомлі ў гістарычнай паэме «Маргер» / М. Варабей // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: зб. арт. у гонар праф. Э. Смулковай / рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]; пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2016 (Беларусіка = Albaruthenica; кн. 37). – С. 217–221.

3. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – Т. 3: Канец XVIII – пачатак XX ст. – 448 с.

4. XIX стагоддзе. Навукова-літаратурны альманах / уклад. і падрыхт. тэкстаў М. Хаўстовіча. – Мінск: БДУ, 1999. – Кн. 1. – 214 с.

5. *Дробов, Л. Н.* Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л. Н. Дробов. – Минск: Выш. шк., 1974. – 336 с.

6. *Заиченко, О. В.* Август фон Коцебу: история политического убийства / О. В. Заиченко // Новая и новейшая история. – 2013. – № 2. – С. 177–191.

7. Историография истории нового времени стран Европы и Америки / ред. И. П. Дементьев. – М.: Высш. шк., 1990. – 512 с.

8. Историография истории южных и западных славян / И. В. Созин (отв. ред.) [и др.] – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1987. – 266 с.

9. *Коцебу, А.* Свитригайло, великий князь литовский, или Дополнение к историям литовской, российской, польской и прусской: пер. с нем. / А. Коцебу. – СПб.: Тип. Мед. департамента М-ва внутр. дел, 1835. – [12], 236, 44, 30 с.

10. *Крашевский, И. И.* Собрание сочинений / Ю. И. Крашевский; под ред. И. И. Ясинского (Максима Белинского); с портретом автора и критико-биогр. очерком П. В. Быкова. – Петроград: Изд-во П. П. Сойкина, 1915. – [Т. VI]. – С. 1–216.

11. *Крашевский, Ю. И.* Кунигас / Ю. И. Крашевский. – Минск: Беларус. навука, 2019. – 309 с.

12. Пиленай. Либретто оперы в 4 действиях, 5 картинах / музыка А. Кловы, либретто И. Мацкониса; подстроч. пер. с лит. – Вильнюс: Вайдзас, [1958]. – 34 с.

13. *Avižinienė, B.* Viešų lietuviškųjų vakarų repertuaro cenzūra XIX a. pabaigos – XX a. pradžios Rusijos imperijoje / B. Avižinienė // Colloquia. – 2015. – T. 34. – P. 37–59.

14. *Baczko, L.* Geschichte Preußens / L. Baczko. – Königsberg: bey Gottlieb Leberecht Hartung, 1793. – Bd. 2. – [2], 422 S.

15. *Baliński, M.* Starożytna Polska pod względem historycznym, geograficznym i statystycznym opisana / M. Baliński, T. Lipiński. – Warszawa: Nakład i druk S. Orgel-

branda, 1846. – T. 3: Wielkie Księstwo Litewskie, opisane przez Michała Balińskiego. – 866, XXVIII s.

16. *Baranauskas, T.* Lietuvos valstybės ištakos / T. Baranauskas. – Vilnius: Vaga, 2000. – 317 p.

17. *Baronas, D.* Pilėnai – das litauische Masada. Auf den Spuren einer Legende / D. Baronas // Zeitschrift für Ostmitteleuropa-Forschung. – 2016. – Bd. 65. – № 3. – S. 346–372.

18. *Baronas, D.* Pilėnai ir Margiris: faktai ir fikcijos / D. Baronas // Istorijos šaltinių tyrimai. – 2008. – T. 1. – P. 52–61.

19. *Baronas, D.* Pilėnai ir Margiris: istorija ir legenda / D. Baronas, D. Mačiulis. – Vilnius: Vilniaus dailės akademijos leidykla, 2010. – 644 p.

20. [*Daukantas, S.*]. Budą Senowęs Lëtuwiû, Kalnienù ìr Zámajtiû, ìszraszzę pagał Senowęs Rasztû Jokyb's Łaukys / S. Daukantas. – Petropìlie spaudinie pas C. Hintze, 1845. – [2], 9, [2], 252 [i.e. 253], [5] p., [1] iliustr. lap.

21. *Daukantas, S.* Istorija žemaitiška / S. Daukantas; parengė B. Vanagienė. – Vilnius: Vaga, 1995. – T. 1. – 663 p.

22. *Daukantas, S.* Raštai / S. Daukantas; tekstą paruošė B. Vanagienė, sudarė V. Merkys. – Vilnius: Vaga, 1976. – T. 1–2.

23. *David, L.* Preussische Chronik nach der Handschrift des Verfassers mit Beifügung historischer und etymologischer Anmerkungen <...> / L. David; hrsg. von Ernst Hennig. – Königsberg: in der Hartungschen Hofbuchdrukkerei. – Bd. 6. S. 130.

24. *Grunau, S.* Preussische Chronik im auftrage des Vereins für die geschichte der Provinz Preussen / S. Grunau; herausgegeben von Dr. M. Perlbach. – Leipzig: Verlag von Duncker und Humblot, 1876. – Bd. I. – Tractat I–XIV. – 800 S.

25. *Gudavičius, E.* Mindaugas / E. Gudavičius. – Vilnius: Žara, 1998. – 359 p.

26. *Kotzebue, A. v.* Preußens ältere Geschichte / A. v.Kotzebue. – Riga: Hartmann 1808. – Bd. 1–4.

27. *Kraszewski, J. I.* Kunigas. Powieść z podań litewskich / J. I. Kraszewski. – Warszawa: S. Lewental, 1882. – 165 s.

28. *Kraszewski, J. I.* Litwa. Starożytne dzieje, ustawy, język, wiara, obyczaje, pieśni, przysłowia, podania i t. d. / J. I. Kraszewski. – Warszawa: Druk Stanisława Strąbskiego, 1850. – T. 2: Historya od początku XIII wieku do roku 1386. – 439 s.

29. *Lasecka-Zielak, J.* Wallenrodyzm / J. Lasecka-Zielak // J. Bachórz, A. Kowalczykowa. Słownik literatury polskiej XIX wieku. – Wrocław: Ossolineum, 2002. – S. 995–996.

30. Lietuvos dailės muziejus. – Inv. Nr. T-13 (Dmachauskas, Vincentas. Kryžiuočiai puola Punios pilį).

31. Lietuvių literatūros ir tautosakos institutas / LLTI (Літоўскі інстытут літаратуры і фальклору). – F. 1. B. 2 ( Daukantas, S. Istoryje Zemaytyszka).

32. Lietuvos Moklų akademijos Vrublevskių biblioteko Rankraščių skyrius / LMAB RS (Бібліятэка Літоўскай Акадэміі навук, аддзел рукапісаў). – F. 29. B. 1056 (Daukantas, S. Istoryje Zemaytyszka).

33. Lietuvos nacionalinis dailės muziejus. – F. B-5: XVIII–XXI amžiaus įvairių asmenų užrašai, dienoraščiai, katalogai ir kiti dokumentai. Ap. 3: Nuolat saugomų skaitmeninių vaizdų apyrašas. B. 1: Laimos Kruopaitės senų nuotraukų kolekcijos skaitmeniniai vaizdai. Vieta byloje 161: Marcelino Šikšnio dramos «Pilėnų kunigaikštis» spektaklio aktoriai. Centre sėdi Marcelinas Šikšnys. – Ryga, ~1910 metai.

34. *Maironis.* Ant Punės kalno ties Nemunu / Maironis // Baras. – 1925. – № 8. – P. 5–8.

35. *Merkys, V.* Simonas Daukantas / V. Merkys; 2 papild. leid. – Vilnius: Vyturys, 1991. – 212 p.

36. *Mickiewicz, A.* Konrad Wallenrod, powieść historyczna z dziejów litewskich i pruskich / A. Mickiewicz. – Petersburg: Drukiem Karola Kraza, 1828. – VIII, 96 s., [3] k. tabl.

37. *Narbutt, T.* Dzieje narodu litewskiego / T. Narbutt. – Wilno: Nakładem i drukiem A. Marcinowskiego, 1838. – T. 4. – XIV, [2], 628, 84 s., [4] k. tabl.

38. Nestor. Russische Annalen in ihrer Slavonischen Grundsprache verglichen, übersetzt und erklärt / hrsgb. von August Schlözer; 5 Theile. – Göttingen: H. Dietrich, 1802–1809.

39. *Schlözer, A. L.* Geschichte von Littauen, als einem eigenen Großfürstenthume, bis zum Jh. 1569 / A. L. Schlözer. – Halle: Gebauer, 1785. –[1] Bl., 544 S.

40. *Schütz, C.* Historia rerum prussicarum, das ist warhaffte und eigentliche Beschreibung des Lande Preüssen, jrer Gelegenheit, Namen und Teilunge von del eltesten Königen an, derselben Regierung und Heidnischer Aufopfferung, auch vom Ursprung des Deutschen Ordens und was sich bey eins jeglichen Hohmeisters Leben und regierung zugetragen hat, vom ersten bis zum letzten, darinnen auch die Ankunft und Erbawung der königlicher Stad Dantzig, und wie sie von Jaren zugenommen, fleissig und mit allen Ömbständen beschrieben und angezeigt wird, aus bewerter Schriften, Historien und Recessen, zusammengetragen und beschrieben durch M. Caspar Schützen, der Stad Dantzig Secretarium / C. Schütz. – Zerbst: Durch Bonaventur Schmid, 1592. – 6 S., 196, [360] Bl.

41. Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich / wyd. pod red. Filipa Sulimierskiego, Bronisława Chlebowskiego, Władysława Walewskiego. – Warszawa: Nakł. Filipa Sulimierskiego i Władysława Walewskiego, Druk «Wieku», 1888. – T. IX: Pożajście – Ruksze, 1888. – 960 s.

42. *Syrokomla, W.* Margier. Poemat z dziejów Litwy / W. Syrokomla. – Wilno: Nakładem Księgarni p.f. Rubena Rafałowicza, 1855. – VIII, 136 c.

43. *Šiaulėniškis, M.* [*Šikšnys, M.*]. Pilėnų kunigaikštis. Tragėdija 5-uose veiksmuose / M. Šikšnys. – Ryga: G. Hempel, 1905. – 92 p.

44. *Šlivinskas, A.* Šiaulių «Varpo» draugija Lietuvos teatro ištakose / A. Šlivinskas // Kultūros barai. – 2008. – № 10. – P. 97–103.

45. *Valančius, M.* Raštai / M. Valančius; parengė V. Vanagas, tekstus redagavo B. Vanagienė. – Vilnius: LLTI, 2001. – T. 1: Vaikų knygelė; Paaugusių žmonių knygelė;

Palangos Juzė; Pasakojimas Antano tretininko; Bičiuliai; Budrys ir jo priepuoliai; Dievobaimingas vaikiukas; Patarlės žemaičių. – XVI + 832 p.

46. Vilniaus universiteto bibliotekos Rankraščių skyrius / VUB RS (Бібліятэка Вільнюскага ўніверсітэта, Аддзел рукапісаў). – F. 1. – B. D104 (Daukantas, S. Darbay senuju Lituwiu yr Zemayczіu).

47. *Voigt, J.* Geschichte Preussens von den ältesten Zeiten bis zum Untergange der Herrschaft des Deutschen Ordens / J. Voigt. – Königsberg: Im Verlage der gebrüder Bornträger, 1830. – Bd. 4: Die Zeit von der Unterwerfung Preußens 1283 bis zu Dieterichs von Altenburg Tod 1341. – X, 637 S.

48. *Wigand von Marburg.* Nowa kronika pruska / Wigand von Marburg; Sławomir Zonenberg, Krzysztof Kwiatkowski (oprac.). – Toruń: TNT, 2017. – 665 s.

49. *Wiiuk Koialowicz, A.* Historiae lituanae pars prior; de rebus Lituanorum ante susceptam christianam religionem, conjunctionemque Magni Lituaniae Ducatus cum Regno Poloniae, libri novem / A. Wiiuk Koialowicz. – Dantisci: Sumptibus Georgii Forsteri Bibliopolae S. R. M., 1650. – 12 + 399 p.

50. *Wiiuk Koialowicz, A.* Historiae Lituanae a conjunctione Magni Ducatus cum Regno Poloniae ad Unionem eorum Dominiorum / A. Wiiuk Koialowicz. – Antwerpiae apud Jacobum Meursium, 1669. – 496 p.

51. *Williamson, G. S.* What Killed August von Kotzebue? The Temptations of Virtue and the Political Theology of German Nationalism, 1789–1819 / G. S. Williamson // The Journal of Modern History. – 2000. – Bd. 72. – P. 890–943.

52. *Wrocki, E.* Konstanty Górski : życie i działalność. 1859–1924 / E. Wrocki. – Warszwa: Rytm, 1924. – 15 s.

53. *Zimmermann, Harro.* Ein deutscher Gotteskrieger? Der Attentäter Carl Ludwig Sand: Die Geschichte einer Radikalisierung / H. Zimmermann. – Paderborn: Ferdinand Schöningh Verlag, 2020. – XVI + 347 S.

**(Дата паступлення: 04.12.2020).**

# СОДЕРЖАНИЕ

**РАЗДЕЛ 1. ИСТОЧНИКИ И ИСТОРИОГРАФИЯ ИСТОРИИ И КУЛЬТУРЫ НОВОГО ВРЕМЕНИ** ........ 3

*Зянюк Р. У.* Польская гістарыяграфічная традыцыя вывучэння дзейнасці рымска-каталіцкіх манаскіх ордэнаў у Беларусі (1772–1917) ........ 3

*Любая А. А.* Дзве запіскі з архіва князёў Друцкіх-Любецкіх у кантэксце барацьбы татараў заходніх губерняў за сваю шляхецкую годнасць у 30-я гады XIX стагоддзя ........ 20

*Чикалова И. Р.* Первая мировая война: русскоязычные публикации документальных и историографических источников (1914–1941) ........ 43

**РАЗДЕЛ 2. ИДЕНТИЧНОСТИ И КУЛЬТУРА ЭЛИТ И НАСЕЛЕНИЯ В ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЕ** ........ 55

*Дзярновіч А. І.* «Магіла волатаў»: рэактуалізацыя нарацыі пра штурм замка Пілены ў 1336 годзе і фарміраванне гістарычнага міфа літоўскай нацыі ў XIX стагоддзі ........ 55

*Завьялова О. О.* «Белорусов мы считаем своими братьями…»: белорусский вопрос в русской общественной мысли второй половины XIX века ........ 77

*Олейник В. В.* «Кое-что сделавший на поприще литературы»: избранные персоналии военной юстиции Виленского военного округа конца XIX – начала XX века ........ 87

*Ушакова Е. С.* Белорусская повестка в деятельности профессоров Варшавского университета (конец XIX – начало XX века) ........ 99

*Шимукович С. Ф.* Региональные проекты в сфере образования на белорусских землях в XIX веке ........ 116

**РАЗДЕЛ 3. ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ИНСТИТУТЫ ИМПЕРИИ В РЕАЛИЗАЦИИ РЕГИОНАЛЬНОЙ ПОЛИТИКИ В ПЕРИОД «ДОЛГОГО XIX ВЕКА»** ........ 133

*Кейко Ю. В.* Законодательная база процесса православного храмового строительства в Беларуси (60-е годы XIX века) ........ 133

*Киселёв А. А.* Уездная полиция белорусских губерний в 1905 году (на примере Ошмянского уездного полицейского управления) ........ 141

*Крот М. Н.* Виленский генерал-губернатор князь П. Д. Святополк-Мирский и проблема «церковно-приходской русификации» Северо-Западного края Российской империи в начале XX века ........ 149

*Синковец А. Ю.* «Этот царствовать не будет!»: цесаревич Алексей Николаевич в Ставке Верховного главнокомандующего (1915–1916) ...... 163

*Шевкун П. В.* Православная церковь на территории Беларуси в системе межконфессиональных отношений (конец XVIII – начало XX века) ........ 177

**РАЗДЕЛ 4. СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКАЯ МОДЕРНИЗАЦИЯ НА БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЛЯХ: ПОВСЕДНЕВНОСТЬ И КОНФЛИКТЫ** ........ 199

*Бусько С. И.* Развлечение аристократов: крокет и теннис на территории Беларуси в начале XX века ........ 199

*Воронич Т. В.* «Цемнякі», «брухарэзы» и «наша паліцыя» – правонарушения на страницах газеты «Наша Ніва» (1906–1915) ........ 209

*Ерашэвіч А. У.* Станаўленне цукровага акцызу на тэрыторыі Беларусі ў канцы 40-х – пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя ........ 227

**Требования к статьям в сборнике «“Долгий XIX век” в истории Беларуси и Восточной Европы. Исследования по Новой и Новейшей истории»** ........ 238

Научное издание

# «ДОЛГИЙ XIX ВЕК» В ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ И ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ: ИССЛЕДОВАНИЯ ПО НОВОЙ И НОВЕЙШЕЙ ИСТОРИИ

Сборник научных трудов

Выпуск 4

Ответственный за выпуск *С. Ф. Шимукович*
Редактор *Н. В. Боярова*
Компьютерная верстка *К. А. Капустиной*

На обложке: картина «Земля» (1898)
Фердинанда Рущица (1870–1936)

Подписано в печать 15.12.2020. Формат 60×84/16.
Бумага офсетная. Ризография.
Усл. печ. л. 14,1. Уч-изд. л. 15,1. Тираж 100 экз. Заказ 102.

Издатель и полиграфическое исполнение
государственное учреждение образования
«Республиканский институт высшей школы».
Свидетельство о государственной регистрации издателя,
изготовителя, распространителя печатных изданий
№ 1/174 от 12.02.2014.
Ул. Московская, 15, 220007, г. Минск.